**Музычная забава «Ходзіць, ходзіць Каляда!» 2026**

Падрыхтавала:
музычны кіраўнік Румо В.В.

(20.01.2026)

Менавіта адным з самых яркіх і папулярных святочных беларускіх народных традыцый, што дайшлі да сучаснасці, з'яўляецца калядаванне. У час зімовых святак музычная зала нашага садка пераўтварылася ў святочна ўпрыгожанную беларускую хату, дзе падчас Багатай Каляды вялікім сяброўскім гуртом, быццам адна дружная сям'я, сабраліся дарослыя і дзеці. Гаспадары Алена і Васіль падрыхтавалі сапраўдны калядны стол з сенам пад нацыянальным абрусам, са снапамі жыта, пшаніцы, лёну, каб быў добры ўраджай у надыходзячым годзе. Беларускі посуд напоўніўся з беларускімі стравамі: куццёй ды блінамі, гарбатай ды баранкамі, хлебам ды бульбай, каўбасамі ды салам, сырам ды квасам, арэхамі ды мёдам, садавінай ды гароднінай.



Гаспадары разам з дзецьмі гучна спявалі калядныя песні «Каляда, калядачкі», «Го-го-го, Каза», шпарка танцавалі беларускі народны танец «Трасуха», жвава кідаліся ў скокі ў карагодзе «Пайшла Каза па лесе».



Асаблівае ўражанне зрабілі калядоўшчыкі. Да хаты гаспадароў прыйшлі дарослыя ў выглядзе Механошы, Зорканошы і Казы, а таксама хлопчыкі і дзяўчынкі, пераапранутыя ў касцюмы калядных персанажаў: мядзведзянят, казлянят, цялятаў, ягнят, ваверак, пеўніка, цыганак.







Калядоўшчыкі з натхненнем выконвалі віншавальныя калядныя песні, спявалі шчадроўкі, шчыра жадалі ўсім шчасця і дабра. Дзеці з гаспадарамі іх добразычліва віталі, запрашалі разам павесяліцца ды

пазабавіцца, за што напрыканцы частавалі калядоўшчыкаў смачнымі прысмакамі.







Усе прысутныя без выключэння з цікаўнасцю і захапленнем гулялі ў еларускія народныя гульні «У Вераб’я», «Козлік», «Михасік», «У Мядзведзя», з асаблівым энтузіязмам выконвалі  альклорныя творы на дзіцячых музычных інструментах у беларускім народным у аркестры.




Цэнтральнай падзеяй у калядным свяце, несумненна, з’явіўся традыцыйны абрад з Казой – сімвалам адраджэння і дабрабыту ў новым годзе.




Напрацягу ўсёй святочнай забавы у зале панавала яркая, жвавая, радасная і добразычлівая атмасфера. Вочы ўдзельнікаў ззялі, нібы калядныя зорачкі, а усмешкі на тварах асвятлялі шчаслівыя твары дзяцей і дарослых.


